УСТАНОВА АДУКАЦЫІ
«Мінскі дзяржаўны лінгвістычны ўніверсітэт»

ЗАЦВЯРДЖАЮ
Прарэктар па вучэбнай рабоце ўстановы адукацыі «Мінскі дзяржаўны лінгвістычны ўніверсітэт»
________________ А.П.Бяценя

«15» лютага 2023 г.

Рэгістрацыйны № УД-36/01/08-1/вуч.

# МЕТОДЫКА ВЫКЛАДАННЯ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ ЯК ЗАМЕЖНАЙ

Вучэбная праграма ўстановы вышэйшай адукацыі
па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасці:

1-21 06 01 «Сучасныя замежныя мовы (па напрамках)»;

напрамку спецыяльнасці:
1-21 06 01-01 «Сучасныя замежныя мовы (выкладанне)»;

спецыялізацыі:
1-21 06 01-01 04 «Беларуская мова як замежная»

2023 г.

Вучэбная праграма складзена на аснове адукацыйнага стандарту вышэйшай адукацыі I ступені па спецыяльнасці 1-21 06 01 "Сучасныя замежныя мовы (па напрамках)", зацверджанага і ўведзенага ў дзеянне пастановай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 30.08.2013 № 88; і вучэбнага плана ўстановы адукацыі "Мінскі дзяржаўны лінгвістычны ўніверсітэт" па спецыяльнасці 1-21 06 01 "Сучасныя замежныя мовы (па напрамках)", напрамку спецыяльнасці 1-21 06 01-01 "Сучасныя замежныя мовы (выкладанне)", спецыялізацыі 1-21 06 01-01 04 "Беларуская мова як замежная", зацверджанага 30.06.2022, рэгістрацыйны № Д 21-1-014-041 вуч.

**СКЛАДАЛЬНІКІ:**

Барысенка В.У., дацэнт кафедры беларускай мовы і літаратуры ўстановы адукацыі "Мінскі дзяржаўны лінгвістычны ўніверсітэт", кандыдат філалагічных навук, дацэнт;

Воінава-Страха М.М., загадчык кафедры беларускай мовы і літаратуры ўстановы адукацыі "Мінскі дзяржаўны лінгвістычны ўніверсітэт", кандыдат філалагічных навук;

Сандалава Т.А., старшы выкладчык кафедры беларускай мовы і літаратуры ўстановы адукацыі "Мінскі дзяржаўны лінгвістычны ўніверсітэт";

Сігаева С.А., старшы выкладчык кафедры беларускай мовы і літаратуры ўстановы адукацыі "Мінскі дзяржаўны лінгвістычны ўніверсітэт".

**РЭЦЭНЗЕНТЫ:**

І. С. Камінская, дацэнт кафедры славянскіх моў установы адукацыі "Мінскі дзяржаўны лінгвістычны ўніверсітэт", кандыдат педагагічных навук

Т. У. Латышава, намеснік дырэктара па вучэбна-метадычнай рабоце філіяла ўстановы адукацыі "Мінскі дзяржаўны лінгвістычны ўніверсітэт" "Лінгвагуманітарны каледж"

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:**

Кафедрай беларускай мовы і літаратуры ўстановы адукацыі "Мінскі дзяржаўны лінгвістычны ўніверсітэт"
(пратакол № 5 ад 27.12.2022);

Навукова-метадычным саветам установы адукацыі "Мінскі дзяржаўны лінгвістычны ўніверсітэт"
(пратакол № 6 ад 15.02.2023).

# I. ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Вучэбная дысцыпліна “Методыка выкладання беларускай мовы як замежнай” з’яўляецца часткай лінгвістычнай падрыхтоўкі будучых выкладчыкаў замежнай мовы (лінгвістаў).

Мэта вывучэння вучэбнай дысцыпліны – фарміраванне і развіццё ў навучэнцаў прафесійных кампетэнцый выкладчыка беларускай мовы як замежнай на розных этапах навучання ва ўмовах моўнага і пазамоўнага асяроддзя.

Асноўнымі задачамі вывучэння вучэбнай дысцыпліны з’яўляюцца:

– фарміраванне ў студэнтаў уменняў выбіраць аптымальныя для пэўнага этапу навучання і кантынгенту навучэнцаў задачы навучання, метады і прыёмы выкладання беларускай мовы як замежнай;

– развіццё агульнавучэбных уменняў і навыкаў: планаванне і арганізацыя вучэбнай дзейнасці, успрыняцце інфармацыі, разумовая дзейнасць, ацэнка і асэнсаванне вынікаў сваіх дзеянняў.

У сістэме падрыхтоўкі спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй у адпаведнасці з вучэбным планам спецыялізацыі 1-21 06 01-01 04 «Сучасныя замежныя мовы (выкладанне). Беларуская мова як замежная» вучэбная дысцыпліна “Методыка выкладання беларускай мовы як замежнай” уваходзіць у цыкл дысцыплін спецыялізацый.

У агульнай сістэме прафесійнай падрыхтоўкі выкладчыкаў замежнай мовы (лінгвістаў) змест вучэбнай дысцыпліны “Методыка выкладання беларускай мовы як замежнай” грунтуецца на веданні вучэбных дысцыплін: “Гісторыя беларускай мовы”, “Практычная фанетыка беларускай мовы”, “Функцыянальная граматыка беларускай мовы”.

Вучэбная дысцыпліна з’яўляеццца завяршальнай, узгадненне з іншымі вучэбнымі дысцыплінамі не патрабуецца.

У выніку вывучэння вучэбнай дысцыпліны “Методыка выкладання беларускай мовы як замежнай” студэнты павінны

*ведаць*:

– агульныя тэарэтычныя асаблівасці методыкі выкладання беларускай мовы як замежнай;

– лінгвістычныя асновы методыкі выкладання беларускай мовы як замежнай;

– змест Стандарта экзаменацыйных патрабаванняў да ўзроўняў валодання беларускай мовай як замежнай, адукацыйных стандартаў і адукацыйных праграм па беларускай мове як замежнай;

*умець:*

– аналізаваць адукацыйныя праграмы, падручнікі па беларускай мове;

– карыстацца навуковай і метадычнай літаратурай, педагагічнымі тэхналогіямі, альтэрнатыўнымі і варыятыўнымі праграмамі;

– выбіраць аптымальныя для пэўнага этапу навучання і кантынгенту навучэнцаў задачы навучання, метады і прыёмы выкладання беларускай мовы як замежнай;

– выкарыстоўваць тэставыя тэхналогіі для кантролю ўзроўню сфарміраванасці розных складнікаў камунікатыўнай кампетэнцыі на розных этапах навучання;

– распрацоўваць методыку правядзення ўрока ў адпаведнасці з яго тэмай і задачамі;

– рэалізаваць адукацыйныя мэты праз тэкстацэнтрычныя мадэлі, выкарыстоўваючы тэкст як адзінку навучання;

*валодаць:*

– методыкай арганізацыі ўрокаў на розных этапах навучання і дыдактычнай рэпрэзентацыі актуальнага лінгвакультурнага матэрыялу.

У адпаведнасці з адукацыйным стандартам па спецыяльнасці 1-21 06 01 “Сучасныя замежныя мовы (па напрамках)” вывучэнне вучэбнай дысцыпліны “Методыка выкладання беларускай мовы як замежнай” павінна забяспечыць фарміраванне наступных кампетэнцый:

**акадэмічных:**

АК–1. Умець прымяняць базавыя навукова-тэарэтычныя веды для рашэння тэарэтычных і практычных задач.
АК–2. Валодаць сістэмным і параўнальным аналізам.
АК–3. Валодаць даследчыцкімі навыкамі.
АК–4. Умець працаваць самастойна.
АК–5. Быць здольным нараджаць новыя ідэі (валодаць крэатыўнасцю).
АК–6. Валодаць міждысцыплінарным падыходам пры рашэнні праблем.
АК–8. Валодаць навыкамі вуснай і пісьмовай камунікацыі на дзяржаўных мовах.
АК–10. Валодаць нормай і узусам фанетычнай сістэмы вывучаемай замежнай мовы.
АК–11. Валодаць нормай і узусам граматычнай сістэмы вывучаемай замежнай мовы.
АК–12. Валодаць нормай і узусам лексічнай сістэмы вывучаемай замежнай мовы.
АК–13. Выкарыстоўваць замежную мову для ажыццяўлення міжкультурнай камунікацыі.

сацыяльна-асобасных:

САК–1. Валодаць якасцямі грамадзянскасці.
САК–2. Быць здольным да сацыяльнага ўзаемадзеяння.
САК–5. Быць здольным да крытыкі і самакрытыкі.
САК–6. Умець працаваць у камандзе.
САК–7. Умець арыентавацца ў сістэме агульначалавечых каштоўнасцяў і ўлічваць асаблівасці цэннасна-сэнсавых арыентацый разнастайных сацыяльных, нацыянальных, рэлігійных і прафесійных супольнасцей і груп у пэўным соцыуме.

прафесіянальных:

*арганізацыйна-кіраўніцкая дзейнасць (выкладаннне)*

ПК–3. Складаць дакументацыю (планы, дзелавыя лісты і т. п.), а таксама справаздачную дакументацыю па ўстаноўленых формах.

ПК–4. Узаемадзейначаць са спецыялістамі сумежных прафесій.

ПК–5. Аналізаваць і ацэньваць сабраныя даныя.

ПК–7. Рыхтаваць даклады, матэрыялы да прэзентацый.

ПК–8. Карыстацца глабальнымі інфармацыйнымі рэсурсамі тэлекамунікацый.

*навукова-даследчыцкая дзейнасць*

ПК–54. Карыстацца навуковай і даведачнай літаратурай.

ПК–55. Ажыццяўляць адбор матэрыялу для даследавання;

ПК–56. Аналізаваць і інтэрпрэтаваць даследуемыя з'явы ў іх узаемасувязі і ўзаемазалежнасці;

ПК–57. Рыхтаваць навуковыя рэфераты, тэзісы выступленняў і даклады;

ПК–58. Афармляць вынікі навукова-даследчыцкай дзейнасці ў адпаведнасці з патрабаваннямі сучаснай інфармацыйнай бібліяграфічнай культуры.

*інавацыйная дзейнасць*

ПК–60. Фарміраваць банк даных інавацыйных тэхналогій па разнастайных аспектах выкладчыцкай, вучэбна-метадычнай, навукова-даследчыцкай і выхаваўчай дзейнасці.

Змест вучэбнай дысцыпліны, формы кантролю і тэхналогіі навучання накіраваны не толькі на набыццё навучэнцамі тэарэтычных ведаў, практычных уменняў і навыкаў, неабходных для асваення спецыяльнасці, але і на развіццё каштоўнасна-асобаснага, духоўнага патэнцыялу навучэнцаў, фарміраванне ў іх грамадзянска-патрыятычных якасцей, гатоўнасці да актыўнага ўдзелу ў эканамічным, сацыяльна-культурным і грамадскім жыцці краіны.

У адпаведнасці з вучэбным планам спецыялізацыі 1-21 06 01-01 04 «Сучасныя замежныя мовы (выкладанне). Беларуская мова як замежная» агульная колькасць гадзін, якая адводзіцца на вывучэнне дысцыпліны "Методыка выкладання беларускай мовы як замежнай", складае 214 акадэмічных гадзін, з іх колькасць аўдыторных гадзін складае 80 гадзін (40 гадзін лекцыйных і 40 гадзін семінарскіх). Самастойная праца студэнтаў плануецца ў аб'ёме 134 гадзін.

Вучэбная дысцыпліна вывучаецца на працягу аднаго семестра (у X семестры) на V курсе.

Формамі бягучай атэстацыі па вучэбнай дысцыпліне з'яўляецца экзамен пасля заканчэння X семестра. Працаёмкасць вучэбнай дысцыпліны "Методыка выкладання беларускай мовы як замежнай" складае 6 заліковых адзінак.

Вучэбная дысцыпліна вывучаецца на беларускай мове.

Форма атрымання вышэйшай адукацыі – вочная (дзённая).